# Макс Шчур

## Завяршыць гештальт

*падарожны псэўдараман з фатаздымкамі*

*Усе правы абаронены. Ніякая частка гэтага выдання не падлягае адлюстраванню, капіяванню, захаванню ў базах дадзеных альбо пошукавых сістэмах, распаўсюджванню любымі магчымымі сродкамі і спосабамі без папярэдняга пісьмовага дазволу праваўладальніка.*

Рэдактар: Сяргей Прылуцкі
Дызайн вокладкі: Макс Шчур
Вёрстка: Выдавецтва «Крок»

**Шчур, М.**

Завяршыць гештальт: падарожны псэўдараман з фатаздымкамі / Макс Шчур. — Тэрнопаль, Украіна: Выдавецтва «Крок», 2015. — 310 с.

ISBN 978-617-692-306-0.

«Завяршыць гештальт» — дзённік падарожжа «чалавека з фотаапаратам» у прасторы і часе, з Чэхіі ва ўлюбёную краіну ягонай маладосці Галандыю. Па дарозе герой-апавядальнік сустракае людзей з розных краін Еўропы і свету, абмяркоўвае з імі надзённыя пытанні эстэтыкі, эротыкі і геапалітыкі і напружана чакае, калі з ім нарэшце здарыцца нешта, што апраўдае ягонае рашэнне выехаць за мяжу — як цяпер, так і дваццаць гадоў таму з Беларусі. Ён пераканаsuccessful, што галоўная сустрэча ягонага жыцця чакае яго ў Амстэрдаме.

© Макс Шчур, 2015
© Афармленне. Выдавецтва «Крок», 2015
© Распаўсюджванне. ТАА «Электронная кнігарня», 2016

# Завяршыць гештальт

## *Падарожны псэўдараман з фатаздымкамі*

### 1.

Чорнае «бэ-эм-вэ» чакае нас каля гандлёвага цэнтру на праскім Сьміхаве, я прыходжу першы, як самы нецярплівы, набліжаюся да маладога хлопца ў курортнай уніформе й цёмных акулярах (якіх ён, паспрачаюся, не здымае ня толькі ўлетку) — той стаіць, абапершыся задам на капот, раз-пораз пазіраючы на гадзіньнік. Павітаўшыся, задаю галоўнае пытаньне:

— Балбатранс?

Адказ на пароль — кароткі абыякавы ківок, таксама нібы дамоўлены. Хлопец яўна не ў захапленьні, што яму давядзецца правесьці дзьве гадзіны ў машыне з чалавекам майго выгляду й акцэнту. Адзіны плюс, які ён бачыць ува мне — мінімальная колькасьць багажу, што складаецца з аднаго заплечніку.

Ад спробы завесьці нязмушаную гутарку пра ня самую цёплую раніцу мяне ратуе падыход яшчэ дваіх балбатрансераў — хлапца гіпстэрскага выгляду й ягонай дзяўчыны. То бок я між спадарожнікамі — мала таго, што адзіны нячэх, дык яшчэ й найстарэйшы. А вось у пары няма ніякіх комплексаў што да выгляду, як кіроўцавага, так уласнага, і да паслугаў Балбатрансу яны яўна зьвярнуліся ўжо дзеля самой назвы. Пасьля кароткага руканьня закідваем заплечнікі ў багажнік, «бэ-эм-вэ» стартуе, урываючыся куляю самагубцы ў прагную пашчу Плзэньскай. Паедзем хутка.

Мне, як чалавеку бяз пары, дасталося пярэдняе сядзеньне побач з кіроўцам, месца «сьмяротніка» —

лічыцца, што менавіта на ім, гэткім спалучэньні электрычнага крэсла й дэтэктара хлусьні, чалавек павінен хоцькі-няхоцькі разгаворвацца, адкрываючы ў сабе задаткі Шахэрэзады, абы толькі ня даць кіроўцу заснуць за рулём. Я перакананы, што ад маіх аповедаў, наадварот, любы кіроўца ўпаў бы ня тое што ў сьпячку, а адразу ў кому, таму лепей спрабую ўпасьці ў сьпячку сам — я і насамрэч сёньня зусім ня выспаўся на канапе ў сябра. Аднак заснуць мне праз тыповы падарожніцкі мандраж не ўдаецца, таму я выдатна чую дыялёг, які адбываецца паміж кіроўцам і гіпстэрам (дзяўчына толькі раз-пораз хіхікае або ўстаўляе ў яго двухсэнсоўныя фразы).

Кіроўца — прадпрымальнік у нейкай неакрэсьленай сфэры бізнэсу (ну, гэтага ён мог і не казаць, пры ягоным выглядзе нічым іншым ён займацца й ня можа), часта ганяе ў Нямеччыну па працы; каб крыху ашчадзіць на бэнзіне (прадпрымальнік? ну так, чэскі) зарэгістраваўся на сайце Балбатрансу, яму ня ў лом падкінуць каго-заўгодна да Нюрнбэргу, Рэгенсбургу ці Дрэздэну, людзям трэба дапамагаць, часьцяком з гэтых паездак нараджаюцца карысныя сувязі, выплываюць карысныя зьвесткі, усё гэта, што ні кажы, жыцьцёвы досьвед, знаёміцца зь людзьмі ўжывую цікавей, чым на ЗнаёмстваЎжывую.ком і г. д. У сваю чаргу, маладая пара (ён праграміст — а хто б сумняваўся; яна — пэдагог па адукацыі, часова бяз працы) даведалася пра Балбатранс акурат праз ЗнаёмстваЎжывую. ком (а не выпадкова, як я), ідэя ім спадабалася, перадусім — утрая таньней за аўтобус, ня кажучы пра цягнік, дагэтуль яны падарожнічалі збольшага стопам, ужо пасьпелі аб’езьдзіць ці ня ўсю Эўропу — Ісьляндыя, Ірляндыя, Шампань або Праванс — але найбольш прыжыліся на другім баку Пірэнэяў, куды цяперака й кіруюцца другі раз запар: завялі там добрых знаёмых, праз адну сяброўку ў Празе, якая прыехала ў Чэхію ратавацца ад беспрацоўя, жыць будуць у

ейнай сям'і, гішпанцы як людзі абсалютна шчырыя й шчодрыя, нягледзячы ні на які крызіс, ёсьць што паглядзець, нашыя маладыя нават пачалі вывучаць гішпанскую мову, яшчэ летась запісаліся на курсы ў Празе, цяпер вось урэшце выявіцца, ці не дарма ўбухалі ў гэта грошы, а як вырастуць дзеці — іх пакуль няма, але несумненна будуць, ужо неўзабаве — добра было б на старасьць гадоў пераехаць туды жыць, цёплы клімат карысны для сусчэпаў, хадзіць па гарах з лыжнымі палкамі, купацца ў моры...

Прачухаўся я ад таго, што ў размове настала нечаканая паўза, якой, як выглядала, папярэднічала нейкае пытаньне — тое аказалася адрасаваным мне, бо кіроўца паўтарыў яго пасьля кароткага сьмяшка абаіх гіпстэраў:

— Дык а вы куды едзеце? — вось як, на «вы»: вынік ці то маёй дэманстратыўнай адасобленасьці, ці то непрыналежнасьці да іхнага пакаленьня, ці то неакрэсьленасьці этнічнага паходжаньня. Замест прадугледжанай тут этыкетам прапановы перайсьці на «ты» адказваю:

— У Галяндыю.

## 2.

Уявіце, што вы пачалі сьцягваць з торэнтаў — ці адкуль вы ўласна тыбзьдзіце кантэнт — які-небудзь даўным-даўно парэкамэндаваны вам кінчык, безь якога вы ўжо надалей ня можаце жыць — ну там, культавую парнушку якую-небудзь, да таго ж у нескарочанай рэжысэрскай вэрсіі — пабачылі з прыкрасьцю, што хуткасьць поўнае гамно й няма рады, ну і забыліся пра яго да часу, а тут вяртаецеся раніцой да кампа й ажно сядаеце на сраку ад зьдзіўленьня, бо пакуль вы спалі, фільм ужо збольшага спампаваўся, мала таго: хуткасьць трафіку зь нічога ніякага падвысілася разоў у сто, і цяпер ваш комп глынае раздачу цэлымі кавалкамі, нібы вашая

ўлюбёная парназорка ў тым самым (яшчэ ня бачаным, але ці не па кадры апаведзеным вам сябрамі) фільме, графік паўзе рыўкамі й расьце, як анаконда — то бок канец загрузкі блізкі як ніколі, неўзабаве вы пагледзіцё ўрэшце гэты эпахальны кінамастацкі твор! Вы ўжо паціраеце ад такой удачы рукі й рыхтуеце сурвэткі, як пры бліжэйшым і цьверазейшым поглядзе на манітор аказваецца, што ўвесь гэты час пампавалі не знакамітую парнушку, а нешта зусім іншае, што супадае зь ёю толькі па назьве, які-небудзь снобскі арт-гаўзавы ацтой, каторы ўжо тым ня менш засраў на вашым гард-дыску цэлых тры гігабайты — што вы будзеце рабіць? Дацягняце фільм да канца дзеля чыстай цікаўнасьці (а што, калі гэта ня простае супадзеньне? можа, вашая падсьвядомасьць хоча вам гэтай памылкай паведаміць нешта важнае? можа, гэтая нявінная й зусім не эратычная стужка зьменіць усё вашае жыцьцё?) — ці разззлуецеся ўканец і выдаліце торэнт нахер перад самым заканчэньнем запампоўкі?

Прыблізна такое ж пытаньне, як вы ў гэтай сытуацыі, задае сабе й любы чалавек, што набліжаецца да саракагадовага ўзросту. Гэта, дарагія юныя чытачы, і называецца нэль мэццо дэль камін, пасярод коміну, або крызісам сярэдняга веку, які бязь лішніх мудрагельстваў ільга апісаць як становішча «ні ўзад, ні ўперад» — узад вам ужо ніхто ня дасьць, а ўперад вам самім неяк няма ахвоты, бо калі вы й раней былі сцыклом і трэсьліся як у ліхаманцы за сваё маладое жыцьцейка, баючыся заўчасна здохнуць або стаць бацькам, што тое самае, то цяпер вы сцыкло яшчэ большае й баіцеся ня толькі памерці, а нават жыць, прычым настолькі, што наадварот шкадуеце: чаму ж не ахвяравалі былі сабой у поўным росквіце сілаў дзеля якой-небудзь высакароднай мэты (самай высакароднай зь якіх, несумненна, ёсьць працяг васкага роду)? Цяпер ужо рабіць гэта позна, страшна і галоўнае — камічна, ніхто вас з гэтай

нагоды не пашкадуе, бо вы і так увасабляеце адпрацаваны біялягічны матэрыял, зь якім ільга рабіць што заўгодна, вам самому ў тым ліку, толк ад яго будзе адзін. Таму замест таго, каб ваяваць з уласнымі дзецьмі, што ўжо дасягнулі пераходнага ўзросту, і жонкай, што ўжо дасягнула разуменьня неабходнасьці жыць з вамі паасобку, вы і задаяцеся падобнымі ідыёцкімі пытаньнямі, абсалютна неістотнымі з гледзішча людзкой грамады як цалку. Разуменьне гэтай неістотнасьці яшчэ больш вас запалохвае і ўганяе ў зацяглую дэпрэсію, сродкаў ад якой існуе ня так і шмат; да самых папулярных зь іх належаць алькагалізм, блядзтва, спорт, самагубства і праца.

Выпрабаваўшы іх па чарзе ў прыведзенай пасьлядоўнасьці (як вы разумееце, беспасьпяхова), я сам канец канцоў запыніўся на апошнім як самым бясьпечным і ўнівэрсальным: з калегамі можна і пабухаць, што таксама ёсьць не абы-якім спортам, з каляжанкамі — калі не паблядаваць, то прынамсі пафліртаваць, а жыцьцё праца скарачае ня горай за самагубства, будучы ўсяго толькі яго адкладзенай формай, таму мець працу ў сярэднім веку — надзвычай важна, і пажадана аддаваць ёй усяго сябе, карыстаючы з таго, што вам ня трэба марнаваць высілкі на сям'ю, як астатнім. З пэўнага часу мая асабістая адданасьць працы (нягледзячы на пэрыядычныя скарачэньні, у тым ліку майго заробку) пачала мацнець літаральна з кожным днём набліжэньня карпаратыву ў гонар маіх саракавінаў (лепшага выразу не прыдумаць, бо кожны юбілей, і гэты асабліва, ёсьць памінкамі па там-прапэрдзю), а рыхтавацца да яго я пачаў, як ужо мне ўласьціва, загадзя, то бок гадоў за пяць да самой даты. Мае мілажальныя калегі, усе як адзін сямейныя, ужо не маглі на гэта глядзець і ўрэшце настукалі на мяне шэфу, які аднаго чароўнага дня выклікаў мяне ў кабінэт, паставіўшы перад мною рубам пытаньне «калі я ў апошні раз быў у адпачынку». Я з гатоўнасьцю адказаў, што летась,

езьдзіў быў да сяброў на выходныя ў Градэц Кралавэ, гэтак жа як пазалетась да суайчыньнікаў у Лысу-на-Лабэ, але ён мой пералік перапыніў (хаця той і безь яго ўжо заканчваўся): не, маўляў, у сапраўдным адпачынку, турыстычным, замежным, курортным ці як ён там біямаць завецца.

Цяжка было не зразумець майго шэфа, а прыкінуцца, што яго не разумееш, яшчэ цяжэй: так званы КаКаДу працаўніка, які ня ўмее адпачываць, зьніжаецца прапарцыйна падвышэньню ягонага імпэту. Разумеў я і сваіх калег: на маім фоне яны выглядалі як вечныя гультаі, якімі насамрэч і былі — можа, сваім упартым нежаданьнем езьдзіць у адпачынак я хачу выставіць напаказ, быццам працую больш і лепш за астатніх? Праз гэта яны штогод і задавалі мне пытаньне, як я правёў лета, дзе быў і што бачыў — гэткая сабе дзе-даўшчына. Як што мне ніколі не было чаго ім адказаць, на працы за мною замацавалася рэпутацыя дамасека й ледзь не ідэйнага ворага падарожжаў.

Мушу прызнацца: факт той, што ў параўнаньні зь сярэднестатыстычным бабылём я перасоўваю сваё цела па паверхні плянэты надзвычай рэдка, неахвоча й пераважна на кароткія дыстанцыі. Гэтак, вядома, было не заўжды, усяго апошніх гадоў дзесяць-пятнаццаць. Якіх толькі аргумэнтаў у абарону сваёй трывалай геаграфічнай пазыцыі я ні прыводзіў: і што далёкая вандроўка для мяне — гэта невыносны лягістычны стрэс, і што грошай мне плацяць ня так і шмат, каб дазволіць сабе такую раскошу, і што Прагу я люблю больш за ўсякія сафары й сэрфінгі, і што людзі, якія надта часта вандруюць, паступова робяцца імуннымі да новых уражаньняў, а старыя ў іх усё больш блытаюцца між сабою, тым часам як мне ўспаміны пра мае юнацкія туляньні даражэйшыя за туляньні самі... (Пра свае сапраўдныя псыхічныя цяжкасьці я тактоўна маўчаў нават перад сваім псыхіятрам.) Марна: калі спачатку мяне лічылі проста дзіваком, то з часам пачалі лічыць проста ўёбкам. Ну хіба ў

нечым яшчэ, апроч падарожжаў, можа наагул палягаць сэнс жыцьця? Пагатоў такога, маўляў, маладога? Якое я марную, седзячы на сваім адным месцы — працоўным? Цяпер, у прысутнасьці шэфа, я сябе ўёбкам і адчуваў: мне зрабілася шчыра сорамна перад ім і калегамі, быццам яны злавілі мяне не на турыстычным, а на сапраўдным цэлібаце (пра які ў маім выпадку таксама, мяркую, здагадваліся), і я ўрачыста паабяцаў шэфу, што неўзабаве пасьля саракагодзьдзя сыду ў доўгі летні адпачынак, які нашая кантора завінавацілася мне за ўвесь час маёй тутэйшай паншчыны.

Як у ваду глядзеў! Так усё і сталася, толькі значна раней: праз які тыдзень пасьля гэтай гутаркі шэф сам адправіў мяне ў адпачынак, прычым яшчэ даўжэйшы — бестэрміновы. Мяне звольнілі, пакінуўшы сам-насам адразу з двума крызісамі: фінансавым і сярэдняга веку. То бок карпаратыву ня будзе. Зэканомілі, падлы. Я быў такі разьюшаны, што ідэя зваліць на нейкі час з Прагі (ды хоць бы з самой Чэхіі!) здалася мне ў новых варунках найлепшым, калі не адзіным, спосабам сабраць у кулак крышынкі раструшчанай самапавагі і ўцячы ад мноства раптоўна ўзьніклых праблем. З гэтым намерам я ўключыў з раніцы свой запылены хатні комп і замест выразу «праца ў Празе» загугліў «вэкэйшнз».

## 3.

Таксі прывозіць маіх гасьцей проста мне пад вокны, я назіраю за імі з вышыні чацьвёртага паверху са спачуваньнем: двух немаладых людзей з фатаздымку акурат цяпер бязбожна аббірае таксіст і нават не дапаможа ім з валізамі — а тыя відавочна цяжкія. Давядзеццаісьці ўніз. На сьпёку. А мо ня варта? Ці не дастаткова проста бзыкнуць ім кнопкай? Недастаткова: кім яны могуць мяне палічыць? Я ж яшчэ малады, поўны сіл, і ўжо такі непаважлівы да

старэйшых. У дадатак, у доме няма ліфта. Халера зь імі: пайду сустрэну, але з пад’езду, у якім смурод сабачых сцакаў выгодна дапаўняецца прыемным халадком, выходзіць ня буду, няма дурных. У самы палудзень. Пунктуальна яны, трэба заўважыць.

Ну вось яна, першая сустрэча па-за віртуальнасьцю. Няёмкая, як усе такія сустрэчы. Больш няёмкімі бываюць толькі першыя хвіліны пасьля сэксу. Параўнаньне зьнешнасьцяў, нагадваньне імёнаў. Бяру найцяжэйшую валізу і амаль бягу зь ёю нагару, абы адкласьці пачатак размовы на пазьней. Спускаюся па яшчэ адну. Чаго яны з сабою панабіралі? Яны што сюды, на стала? Цяжка ўсё-ткі дыхаць з такой вагой (я пра валізы) і такім смуродам. Але падміргваю гасьцям, маўляў, не бяды, хутка выветрыцца (хлусьня). Ўэлкам ту май апартмэнт.

Зь сенцаў ім насустрач адразу кідаецца, непрыемна аблізваючы насы, смурод маіх цыгарэт, паводле трываласьці параўнальны з сабачым на лесьвіцы. Між Сцылай і Харыбдай. Ну, затое ў цэнтры. Абое моршчацца, жонка нешта напаўголаса кажа мужу па-галяндзку (якіх толькі моваў у маёй хаце ні гучала, але галяндзкая ўпершыню) — той толькі моўчкі хавае вочы. Тады яна сама зьвяртаецца да мяне па-ангельску:

— Вы курыце дома?

— Толькі ў адным пакоі, — а гэта ўжо не хлусьня: ён у мяне адзін, затое вялікі.

— Пра курэньне ў вашай абвестцы не напісана, — ушчувае мяне госьця.

— Гэта я наўмысна, — зноў спрабую я пажартаваць. — Інача да мяне ніхто б не паехаў.

Аднак дама кажа мне без усякіх сьмешак:

— Калі ласка, у нашым доме не курыце. Можаце курыць на дварэ ці ў дворыку, толькі ня дома.

— Што вы, ні ў якім разе. То бок ні ў якім разе дома.

Вось тут у мяне купальня з прыбіральняй...

— Разам?

— Тут так паўсюль, што зробіш... Я таксама ня мог прывыкнуць. Але цяпер лічу, што так зручна. Вось у гэтай частцы гасьцёўні — кухня...

— Так, яе мы на фатаздымку бачылі. Яна нас цалкам задавальняе.

— Мяне таксама. Заўважце, як новая! — я ёю наўмысна нячаста карыстаюся...

— У вас няма мыйнай машыны?

— Пральнай? Ёсьць...

— Не, для посуду.

— Ды колькі таго посуду... Ён дарэчы вось тут. Я ем збольшага на канапе, але вы можаце ўжываць пісьмовы стол...

кажа: Мужчына ўрэшце не вытрымлівае і ўподсьмех

— Не пераймайцеся, мы пастараемся больш хадзіць па рэстарацыях. Файная ў вас кватэра, утульная — для двух старых сама тое.

— Ну што вы, старых... — думаю, як яшчэ лепей зрабіць ім камплімэнт, але пастанаўляю, што хопіць і гэтага. — Можа, вам якой гарбаткі ці кавы з дарогі?

— Мне кавы, калі можна, — адказвае жонка.

— А я гарбаты вып'ю, — падтрымлівае прапанову мужчына. Для мяне гэта выдатная нагода заняць рукі й паказаць, якая я ахайная сам-сабе-гаспадыня. Я яшчэ ня ведаю, што мяне чакае наперадзе. Але пакурыць мне карціць ужо зараз.

Сядаем за стол, я раздаю на траіх пітво й пячэньне.

— Як даляцелі? — пачынаю з абавязковага.

— А што тут ляцець, — махае рукой мужчына з гераічнай абыякавасьцю маёра Гагарына. — Вы ж таксама да нас самалётам?

Бяз гэтага пытаньня, вядома, нельга. Адказваю шчыра:

— Я б пайшоў пешкі, але адпачынак кароткі — таму машынай.

Пара насьцярожваецца. Ня можа зразумець, чаму я ўвесь час гэтак дзіўна жартую. Ну сказаў бы, што баюся лётаць самалётам, усе б зразумелі. Але ж пешкі? Хіба гэта сьмешна?

— У вас ёсьць машына?

— Няма. — Вырачаныя вочы. — Я паеду... стопам. Канец, я цалкам сапсаваў сваю рэпутацыю. Чалавек, які езьдзіць стопам у сорак гадоў? Як гэта называецца? Слушна: лузер.

Я спрабую выправіць памылку:

— То бок таксі...

І адразу ж усьведамляю, што гэта гучыць яшчэ больш абсурдна, чым «пешкі» ці «стопам». Асабліва з улікам таго, колькі ім каштаваў прыезд зь лётнішча. Галяндцы настолькі зьбітыя з тропу, што пастанаўляюць прыпісаць хаос у маёй галаве майму няведаньню ангельскай. Урэшце, якая ім розьніца.

— Значыць, вы выяжджаеце сёньня?

— Не, заўтра з раніцы.

Зноў няёмкая паўза. Яны пераглядаюцца, і гэтым разам слова бярэ мужчына, як старэйшы па званьні. Справа сур’ёзная:

— Калі не памыляюся, у нашым кантракце як пачатак абмену пазначаная ўжо заўтрашняя дата...

— Не памыляецеся, усё слушна. Я сёньня пераначую ў сябра.

Сужэнцы ківаюць галовамі з радасным разуменьнем. Спалохаліся ўжо, што давядзецца спаць са мной — яўным псыхапатам — у адной хаце, хай нават у маёй — можна ўявіць сабе, як яны цяпер хвалююцца за сваю! Трэба скарыстаць гэты момант для пералому ў гутарцы. Дастаю свой адзіны й галоўны козыр: ключы ад дому.

— Вось гэты ад ніжніх дзьвярэй, гэты ад кватэры... Гаспадар пра ўсё паінфармаваны й ня мае нічога супраць...

Пошту забіраць ня трэба... Дзьверы на вуліцу лепш на ноч замыкаць на ключ, раён ня самы бясьпечны... Дый самі пільнуйцеся, калі будзеце позна вяртацца...

— Можаце не тлумачыць, мы ня першы раз у замежжы, — усьміхаецца мужчына. Я ў гэтым не сумняюся.

— Гэта наш трыццаць першы абмен! — з гонарам дадае жанчына.

— Трыццаць першы?!

— Так, мы карыстаемся Дамбартэрам штогод.

— То бок, вы ўжо трыццаць адзін год разам? — удакладняю я, удаючы жартаўлівы недавер, за якім павінна хавацца захапленьне.

— Сорак, — з сур'ёзным тварам яшчэ болей удакладняе мужчына.

## 4.

Прызнаюся, што на працягу гадоў я недаацэньваў інтэрнэт як сродак фармаваньня жывой матэрыі ў нешта падобнае да цывілізацыі і бачыў у ім у лепшым выпадку электронны аналяг колішніх дымавых сыгналаў. Паводле маіх уяў, ён нагадваў гэткую вясковую дыскатэку, дзе пад дошкай аб'яў сельсавета зьбіраюцца па вечарах непаўналетнія хуліганы, каб слухануць музло, абмеркаваць настаўніц, памацаць дзевак, скінуцца на траіх, выклікаць адзін аднаго на разы, абасцаць плот ці напісаць на ім слова з трох літараў — праз усё гэта ў клюбе надта тхніць лайк тын сьпірыт. З часам, аднак, дзякуючы інвэстыцыям прыватнага капіталу, вясковы клюб перабудавалі ў абласны палац піянэраў, зь бібліятэкай, музеем, дзіцячым пакоем, кінатэатрам (для дарослых і недарослых), спортзаляй, гурткамі па інтарэсах, тэлефоннай будкай, супэрмаркетам на першым паверсе, казіно, жывым стрыптызам, кабінэтам псыхоляга, службай знаёмстваў, аддзяленьнем ашчаднага

банку, біржай працы й цэнных папер, карацей, ледзь не з раддомам, абляпіўшы палац зьсярэдзіны й звонку рэклямнымі плякатамі й зрабіўшы ўсё гэта больш інтэрактыўным за саму рэчаіснасьць. Мацаньню дзевак, лаянцы й арганізацыі каляровых ці там чорна-белых рэвалюцый былі цяпер адведзеныя чыста вымытыя прыбіральні з так званымі мадэратарамі на ўваходзе і выхадзе, непасрэдна каля офісаў інфармацыйных агенцтваў. І тым ня менш пэрыядычныя наведваньні гэтага храму імя чалавечага духу, дзе штодня адбываўся цуд ператварэньня лайна ў віно й назад, так і не зрабілі зь мяне яго заўсёдніка, пагатоў верніка. Магчыма, галоўную ролю тут згуляла адсутнасьць у ім нармальнага піўбару — хаця паступова я навучыўся прыносіць бухло з сабой і выседжваць каля манітору ў тупым безудзельным сузіраньні неўтаймоўнай людзкой актыўнасьці, адчуваючы штосьці паміж агідай, зайздрасьцю й шчырым захапленьнем. Практычную карысьць гэтага спэктаклю я зразумеў толькі тады, калі ў храме мне дапамаглі знайсьці легальную працу, а потым і хату — таму цяпер, страціўшы першую, я спадзяваўся на тое, што змагу зноў адшукаць там чарадзейны сродак ад беспрацоўя й беспэрспэктыўя.

Да знаёмства з Дамбартэрам.ком я не ўяўляў сабе, колькі сілы, фантазіі й волі да самаарганізацыі драмае ў тым, што называецца сярэдняй клясай. У сваёй наіўнасьці я прывык быў лічыць усё сярэдняе пасрэдным, шараговым і шэрым, кажучы па-чэску шэрэдным (нягеглым, брыдкім) — але ж ужо для таго, каб ня ўпасьці ў пралёт сацыяльнай лесьвіцы або папросту дажыць да сярэдняга веку, трэба выявіць немалыя практычныя здольнасьці, нават па-свойму таленты. Уласна, сярэднюю клясу і ўтвараюць збольшага людзі сярэдняга веку, якія ў маладосьці мудра паставілі ўвесь свой час і невялічкі стартавы капітал не на перамогу ці паразу, а на мірную нічыю ў таварыскім матчы між сабою й сьветам,

бо зразумелі, што галоўнае тут не перамагчы, а прынамсі не прайграць. Навучыцца такой абачлівасьці й жывучасьці ніколі ня позна — пасьля пэнсіі як знойдзеце.

На першы погляд Дамбартэр.ком — звычайная сацыяльная сетка, дзе людзі табунамі фрэндзяцца й адфрэнджваюцца між сабой праз адсутнасьць іншай забавы, але ўжо на другі разумееш, што ўсіх іх яднае адзін вельмі практычны інтарэс, які ў дадзеным выпадку часткова супадаў з маім: аб'езьдзіць палову сьвету й яшчэ на гэтым зэканоміць, паказаўшы дупу ўсім турыстычным агенцтвам, гатэлям і платным віртуальным пасярэднікам падобных паслуг. Сама прыдумка прывяла мяне ў захапленьне сваёй антыкапіталістычнай скіраванасьцю й немудрагельнасьцю: вы проста выстаўляеце на гэткі дармовы аўкцыён уласную хату і чакаеце, ці не захоча нейкі замежнік пажыць у ёй на той час (тыдзень, два, месяц, паводле працягласьці адпачынку), пакуль вы ў сваю чаргу пажывяце ў ягонай. Вось яна, выгада ўласнага жытла, наяўнасьцю якога так ганарыцца сярэдняя кляса! Гэта ў эканоміцы называецца, здаецца, гранічнай карысьцю: у выпадку хаты яна палягае ў магчымасьці зь яе ўрэшце куды-небудзь зваліць! (Ну і яшчэ спаліць яе з мэтай страхавога падману.) Не, не падумайце, уласнай хаты ў мяне няма, я ўсяго толькі здымаю кватэру — але каму які да гэтага клопат? Толькі майму гаспадару — ну, зь ім мы ўжо неяк дамовімся, ён мужык нармалёвы, раз ужо наагул мяне да сябе пусьціў. Вось калі б я жыў на дармовай службовай кватэры ад канторы, як некаторыя былыя калегі, або ў сацыяльнай маласямейцы, як яшчэ два гады таму, то мне дакладна паказалі б аўкцыён. Адным словам, я адразу ж па-хуткаму прыбраўся, схапіў нядаўна набытую камэру і зладзіў сваёй прасторнай аднапакаёўцы без пакаёўкі фатасэсію, заліў вынікі на Дамбартэр і расьпісаў там усе выгады месца свайго пражываньня й яго ваколіцаў, пасьля чаго стаў чакаць фантану прапановаў па абмене на самы

бліжэйшы час — да наступнай працы я цалкам вольны! Пры гэтым, бляха, воляю лёсу жыву ў самой залатой Празе, маці гарадоў, ледзь не ў культурным цэнтры Эўропы! Сардэчна, маўляў, запрашаю!

Мая наіўнасьць ды завышаная самаацэнка і тут мяне не падвялі, падрыхтаваўшы мне чарговы непрыемны сюрпрыз: дні міналі, а ніякага фантану, з россыпу скарбаў якога я мог бы выбраць найбольш адпаведны сабе варыянт, на маім дамбартэраўскім профілі так і ня выбухнула. Заклапочаны, ці ня ўлез я зноў у якую пад'ёбку, наўмысна створаную для такіх як я лахоў, я пачаў сам вывучаць прапановы астатніх і неўзабаве зразумеў прычыну адсутнасьці іхнага імпэту. Прычына была ня ў тым, што мая кватэра паводле ўсясьветных мерак замалая (як я баяўся спачатку), а проста ў тым, што гэта кватэра. Як я мог забыцца, што маю справу не з абы-якой сярэдняй клясай, то бок зь людзьмі па-любому збольшага сямейнымі, а зь сярэдняй клясай эўрапейскай, заходняй і разбэшчанай камфортам, у якой да такой раскошы як сям'я абавязкова прыкладаецца ўласны дом, калі ня два, пажадана з басэйнам і двухпавярховы! Мяняць такую фазэнду ў маляўнічым прыгарадзе на халасьцяцкі бэльэтаж у забруджаным, хай сабе самым гістарычным таўне даўнаў ніхто, вядома, ня будзе.

Закусіўшы вусы, мне давялося, такім чынам, заняцца ўласнымі пошукамі магчымых кандыдатаў на абмен, якія я ад пачатку мусіў абмежаваць на ідэальны вобраз «Самотнага Пэнсіянэра-Рэйнджэра», выжытага дзецьмі з бацькоўскага дому ў паўтарапакаёўку ці нават проста пакой дзе-небудзь на выселках. Такіх на Дамбартэры было небагата, і тым ня менш мне ўдалося адшукаць парачку-другую няўрымсных дзядкоў і бабулек! — толькі для таго, каб пераканацца, што да нас на Ўсход яны неяк ня надта імкнуцца: ці то таму, што за пасьлярэвалюцыйныя гады бальшыня пэнсіянэраў у Празе прынамсі аднойчы ўжо была (і некаторыя зь іх,

пабачыўшы яе, на месцы заручыліся з брукам), ці то таму, што Чэхія ня толькі, трасца, ня мае мора, але й замала яшчэ заходняя, каб пэнсіянэры пачувалі сябе тут як дома, і ўжо замала ўсходняя, каб пра яе наведваньне можна было расказаць на тым сьвеце як пра прыгоду. Дый асноўны сэнс Дамбартэра — гэта якраз адсутнасьць усякіх прыгодаў, нечаканасьцяў, кідалаваў, абломаў (ну зусім тое, што мне трэба), пры максымальным захаваньні ўласьцівага сярэдняй клясе хатняга камфорту — то бок магчымасьць зьмяніць усё, не зьмяняючы па сутнасьці нічога. Ужо таму, што гэта гучала як ідэальны рэцэпт на працяг майго (дый, па шчырасьці, любога) жыцьця, я быў гатовы змагацца ў сваіх пошуках да канца.

## 5.

Нягледзячы на рэзкую перамену свайго жыцьцёвага стылю й на сам ляйтматыў гэтага аповеду, я па-ранейшаму лічу, што другая паводле занудзтва катэгорыя людзей — гэта тыя, хто любіць размаўляць на другую паводле занудзтва тэму, «Падарожжы». (Першае месца ў маім прыватным рэйтынгу занудных тэмаў належыць гутаркам пра мовы, трэцяе — абмеркаваньню галівудзкіх фільмаў.) Іхныя маналёгі складаюцца зь віртуознага жангляваньня замежнай тапанімікай, бухгальтарскага ўліку коштаў, выдаткаў і прыбыткаў, усё гэта разбаўленае ў лепшым выпадку досыць нясьмешнымі анэкдотамі з турыстычнага жыцьця, над якімі яны самі спрабуюць рагатаць да зьнямогі, не раўнаючы благія комікі, што імкнуцца заразіць аўдыторыю ня столькі сваім гумарам, колькі гуморам. Найгоршы варыянт — гэта калі такіх заўзятых занудаў два боты пара, і яны да ўсяго яшчэ й вандруюць дуэтам, страхуючы адзін аднаго як альпіністы; у такім разе іхныя аповеды разьвіваюцца паводле формулы «А памятаеш, як

у… мы (набухаліся, заблукалі, сустрэлі, натрапілі, аблажаліся й г. д.)?» «Так, во было сьмеху!» (Гігігі.) Тады (як, напрыклад, цяпер) задняе сядзеньне машыны ператвараецца ў маіх вачах у сямейную канапу пасярод гасьцёўні, не хапае яшчэ толькі альбому з фатаздымкамі. Як жа, памойму, бракуе сёньня людзей кшталту Рэмона Русэля, які ў свой час аб'ехаў цэлы сьвет і не пабачыў у ім папросту ні халеры! — бо не выходзіў з свайго гермэтычнага фургону. Сумняюся, аднак, што мае спадарожнікі ведаюць, хто гэта такі.

Пачуўшы «Галяндыя», хлопец-гіпстэр па-змоўніцку падміргвае мне ў люстэрку задняга бачаньня: малаток, маўляў, усё ясна, яны зь дзяўчынай самі вялікія аматары травы. Ды не аматар я ніякай травы, я нават бухаць год таму кінуў (чакайце! а ці ня ў гэтым сапраўдная прычына таго, што мяне звольнілі? з фармулёўкай «пачаў цурацца вечаровых тым-білдынгаў»?), гэтая іхная трава мяне ўжо аднойчы, фактычна, да эміграцыі давяла — але ж гэтага я ім казаць ня буду, таму толькі крыва ўсьміхаюся ў адказ, робячы выгляд знаўцы з шматгадовым стажам — настолькі шматгадовым, што каб апавесьці пра яго ня хопіць і кругасьветнага плаваньня, то нашто марна словы траціць. Сьціпласьць прафэсіянала. У прынцыпе, яно і праўда: калі я падкурваў сваю першую штакету, іхныя бацькі яшчэ трахаліся з прэзэрватывам, а калі гасіў апошнюю — з прэзэрватывам трахаліся ўжо яны самі. Таму ня ім мяне папракаць, што перапынак між гэтымі штакетамі быў такі доўгі — для мяне ён быў роўны аднаму пералёту шалёнай сьвіньні. Я ж не вінаваты, што першая штакета ўвесь гэты час мяне не адпускала.

Ну, раз я маўчу, то хлопец ужо ніяк ня можа прагапіць моманту самому пачаць гутарку на такую ўдзячную й блізкую яму тэму — ён бы ўсё адно закрануў яе рана ці позна: ах, маўляў, якая цудоўная шмаль у Гішпаніі! Дачакацца ня можам! Дарэчы, нічым ня горшая, чым у

Амстэрдаме — дзе яны таксама, натуральна, былі — затое нашмат таньнейшая! Ледзь не задарма! Наагул, у Гішпаніі апроч беспрацоўя ўсё клёва — і вінчык, і хаўчык, і цёпла, і нерухомасьць недарагая, цэлыя вёскі цяпер прадаюцца... А як там з імігрантамі?, нечакана перабівае яго кіроўца, які быў толькі на Маёрцы і ня бачыў ня тое што ніводнага імігранта, але й ніводнага гішпанца. Ды нармальна, уступае ў гутарку дзяўчына, іх там ня столькі, як у той жа Нямеччыне, пра Францыю лепш маўчу. Не, ну там шмат лацінасаў, удакладняе хлапец, але яны нармальныя, іх ад гішпанцаў практычна не адрозьніш. Я пра чорных там, арабаў, настойвае кіроўца, каб не было непаразуменьняў, то бок не пра лацінасаў, гішпанцы для яго самі лацінасы. З гэтымі там поўны парадак, супакойвае яго хлопец, асабліва ня сунуцца. Гішпанцы, маўляў, наагул малайцы: пабудавалі ў сваіх афрыканскіх правінцыях высачэзны мур, такі цяпер у Вугоршчыне таксама будуюць, і дазволу ніякага Брусэлю не пыталіся, ня тое што ў нас...

Ага, вось мы ўрэшце і закранулі самую гарачую чэскую тэму апошніх месяцаў: уцекачы з Поўдня. Як ні парадаксальна, у гэтым пытаньні прасунутыя гіпстэры заадно з рэтраградам-стырнавым (а мо яны, як дасьведчаныя вандроўнікі, толькі прыстасоўваюцца пад кіроўцу, каб той крый бог ня высадзіў іх з машыны? наўрад ці): гнаць іх, маўляў, з нашае Эўропы, і асабліва з Чэхіі, сраным венікам. У найгоршым выпадку хай іх прымаюць тыя, хто бамбардаваў Лівію ці Сірыю, дый па ўсім. Выслухваць гэтыя знаўскія меркаваньні ў мяне няма падстаў, іх і без таго поўныя інтэрнэт-форумы. Таму я карыстаюся выпадкам, каб зноў паспрабаваць прымгнуць — але ж сон мне, прабачце за таўталёгію, удаецца самае большае ўдаваць.

Падумаць толькі, амаль трыццаць гадоў мінула з часоў чэскай «славутай рэвалюцыі», «плюшавай»

(як яе называюць скептыкі) ці «аксамітнай», а людзі ўсё

яшчэ ніяк не нахаваюцца свабоды перасоўваньня, перадусім — на Захад (хаця апошнім часам уваходзяць у моду ўсё больш экзатычныя куткі сьвету). Гэтая свабода, дарэчы, ёсьць ледзь не галоўным аргумэнтам у незгасальных (і чым далей, тым болей!) спрэчках наконт таго, ці варта было скідваць камуністычны рэжым: маўляў, пры камуністах мы не маглі падарожнічаць! Гэта факт — затое маглі эміграваць, асабліва пры канцы шасьцідзясятых, калі Захад прыўзьняў жалезную заслону для тых, хто ўцякаў ад савецкіх танкаў. Аднак фішка ў тым, што эмігрант і турыст — ня проста два глыбінна адрозныя, а папросту варожыя людзкія тыпы, і да эміграцыі чэхі, турысты ад прыроды, ставяцца надзвычай адмоўна, амаральнейшага ўчынку ў дачыненьні да бацькаўшчыны й асуджаных на яе супляменьнікаў быць ня можа. Таму ніякіх эмігрантаў яны ня любяць: ні сваіх, ні пагатоў чужых. «Паўсюль добра — дома найлепш», кажа гэты маленькі, горды й ксэнафобны народ. Маўляў, мы да вас ня едзем — дык якой трасцы вы лезеце да нас? Зрабіце так, каб і вам у сябе дома было найлепш. А што ў вас дома няма дома — ну не, такога не бывае. «Кожны будаўнік уласнага шчасьця» — яшчэ адна тутэйшая прымаўка.

У пэўным сэнсе, свабода перасоўваньня (вядома, для нас, а не для іншых, мы ж яе заслужылі, толькі вось невядома, чым) насамрэч ёсьць адзінай свабодай, атрыманай у выніку надыходу дэмакратыі: прастуй куды хочаш, ніхто цябе тут не трымае. Насуперак традыцыйнаму вонкаваму патрыятызму, усё больш і больш чэскай моладзі вымушана карыстаецца гэтай свабодай дзеля паляпшэньня ўласнага жыцьця, праглынуўшы неяк тое страшнае прыніжэньне, якое нясе з сабою статус эмігранта (жабрака на чужым хлебе!) уваччу іхных суграмадзянаў. (Цікава, што ў суседзяў-славакаў няма гэтага комплексу, яны з задавальненьнем перасяляюцца ў Чэхію й дамоў амаль ня езьдзяць, заспакойваючы сябе тым, што могуць зра біць гэта ў любы

час.) Што да мяне, то ў даўнюю пару маіх папярэдніх выездаў з Чэхіі ў вялікую Эўропу ніякага Шэнгену яшчэ не было, таму свабода перасоўваньня заўжды была ў маім уцякацкім выпадку досыць умоўнай: з маім сумнеўным выглядам і так званым жэнэўскім псэўдапашпартам мяне штораз падоўгу трымалі (а аднойчы і затрымалі) на мяжы, правяраючы дакумэнты, багаж, аднаго разу нават кішэні, а яшчэ аднаго абнюхвалі мяне сабакам і сьвяцілі ліхтарыкам у дупу ў надзеі адшукаць тую самую траву, якою ад мяне пахла, бо я быў пазычыў у сябра-панка ў дарогу цёплую куртку — пра дэпартацыю зь Нямеччыны за адсутнасьць грошай на квіток да Прагі наагул памаўчу... Можаце ўявіць сабе, як мяне ненавідзелі тагачасныя чэскія спадарожнікі, калі па маёй віне аўтобус ці цягнік мусіў зноў прастойваць на парозе шчасьця, нібы за глыбокім сацыялізмам, пазбаўляючы іх таго цуду, дзеля якога яны ўласна і выехалі: шансу бескантрольна пакінуць сваю любую бацькаўшчыну! Усё гэта, разам з раней згаданымі фактарамі, урэшце і адбіла ў мяне паступова ахвоту да актыўнага турызму. Цяпер гэта наагул, бадай, першы раз, што я перасёк (дзякуй табе, божа!) чэска-нямецкую мяжу бяз пашпартнага кантролю.

Тым часам кіроўца з гіпстэрамі на ўсю машыну спаборнічаюць у радыкальнасьці варыянтаў разьвязаньня іміграцыйнай праблемы: спыніць выдачу візаў, пабудаваць мур, рэпатрыяваць ужо «інтэграваных», выйсьці з Эўразьвязу, абвясьціць іслам па-за законам... (Згода, разам з хрысьціянствам, устаўляю я свае пяць цэнтаў — нібыта жартам.) Тут раптам да іх даходзіць, што я ня сплю і што іхную патрыятычную рыторыку магу, як чужынец, успрыняць на свой конт, таму юны аматар травы пачынае разьвіваць альтэрнатыўную лінію: вядома ж, маўляў, такіх ціхіх, мірных, інтэлігентных і сумленных людзей як я, што настолькі добра валодаюць чэскай, іхныя праекты